## ДА 100-ГОДДЗЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

*Сімвал беларускай кніжнасці*


Марына ПШЫБЫТКА,
вучоны сакратар Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі


# НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ: ПРАЗ ПРЫЗМУ СТАГОДДЗЯ

100-годдзе – добрая нагода, каб успомніць найбольш значныя дасягненні ўстановы. Прыярытэтным кірункам дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі заўсёды заставалася навуковая работа. Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры замацаваны статус НББ як навукова-даследчага цэнтра па бібліятэчнай справе. І гэтае званне яна з гонарам пацвярджае на працягу ўсіх гадоў функцыянавання.

Навуковымі даследаваннямі бібліятэка займаецца амаль з пачатку існавання. Аналіз запатрабаванасці літаратуры, павелічэнне хуткасці абслугоўвання карыстальнікаў – такія і многія іншыя праблемы, што паўставалі ў штодзённай практыцы, вырашаліся ў першыя гады яе працы праз фармалізаванае назіранне і аналіз яго вынікаў. Да цяперашняга часу не захаваліся справаздачы бібліятэкараў. Але каб пераканацца ў навуковасці падыходаў да праблем, дастаткова прааналізаваць тэматыку лекцый на курсах павышэння кваліфікацыі, што рэгулярна арганізоўваліся ў 1930-я гг. для супрацоўнікаў бібліятэкі: прынцыпы і формы камплектавання Дзяржаўнай бібліятэкі, асноўныя метады бібліятэчнай работы, крытычна-бібліяграфічны агляд твораў і г. д. [1].

Пра тое, што ў першай палове XX ст. навуковыя даследаванні займалі пачэснае месца ў пераліку асноўных кірункаў дзейнасці ўстановы, сведчыць і той факт, што ў пачатку 1940-х гг. "у мэтах умацавання сувязей з савецкай грамадскасцю, узгаднення работы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна з работай бібліятэк і бібліяграфічных устаноў" у якасці дарадчага органа пры бібліятэцы быў створаны вучоны савет пад старшынствам дырэктара. У яго склад уваходзілі дырэктар бібліятэкі, яго намеснік па навуковай частцы, загадчыкі аддзелаў, бібліёграфы-спецыялісты, прадстаўнікі іншых бібліятэк, інстытутаў і выдавецтваў, а таксама асобныя навуковыя работнікі. На вучоны савет ускладаўся разгляд вытворча-тэматычных і выдавецкіх планаў па навукова-даследчай рабоце бібліятэкі, тэматыкі камплектавання фондаў, пытанняў абслугоўвання, а таксама абмеркаванне матэрыялаў, падрыхтаваных бібліятэкай да друку [1].

Можна вылучыць тры асноўныя кірункі навуковых даследаванняў, што праводзіліся ў бібліятэцы на працягу ўсяго яе існавання: бібліятэказнаўства, кнігазнаўства, бібліяграфія.

Адна з асноўных тэм навукова-даследчай дзейнасці НББ у галіне бібліятэказнаўства, пачынаючы з 1950-х гг., – гісторыя бібліятэчнай справы. Першым бібліятэчным гісторыкам можна лічыць дырэктара І. Сіманоўскага, які ў дакладзе "Развіццё бібліятэчнай справы ў БССР, яе вынікі і перспектывы да 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі" ўпершыню прааналізаваў бібліятэчнае развіццё за пэўны храналагічны перыяд [2].

Вывучэнне гісторыі бібліятэк было працягнута. У 1978 г. убачыў свет першы зборнік "Бібліятэчная справа ў БССР. Дакументы і матэрыялы. 1918–1941 гг.". На сёння ўжо выдадзена пяць зборнікаў па гісторыі айчыннай бібліятэчнай справы [3–7]. Акрамя таго, у 2020 г. завершана работа "Станаўленне і развіццё бібліятэк Беларусі: архіўныя дакументы", у выніку чаго быў створаны яшчэ адзін інфармацыйны рэсурс, які дапоўніў ужо ўведзеныя ў навуковы зварот архіўныя дакументы [1].

Выдатным вынікам амаль 70-гадовых намаганняў даследчыкаў стала навукова-даследчая

работа “Сістэма захоўвання і забеспячэння свабоднага доступу праз інтэрнэт-тэхналогіі да дакументнай інфармацыі па бібліятэчнай справе Беларусі як часткі нацыянальнай культурнай спадчыны”, рэалізаваная ў 2020–2022 гг. пры садзейнічанні Фонду фундаментальных даследаванняў. Анлайн-рэсурс “Бібліятэчная справа Беларусі ў дакументах і матэрыялах”, які з’явіўся ў выніку гэтай працы, даў магчымасць знаёміцца з поўнымі тэкстамі дакументаў праз інтэрнэт, тым самым папулярызуючы бібліятэчную справу Беларусі не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі [8]. Матэрыялы ўяўляюць сабой найбольш поўную крыніцазнаўчую базу для далейшага вывучэння гісторыі бібліятэчнай справы краіны і ўжо знайшлі плённае адлюстраванне ў навуковай манаграфіі “З мінулага ў будучыню. Бібліятэкі Беларусі” доктара педагагічных навук, прафесара Р. Матульскага [9].

Гісторыю ствараюць людзі. Таму вывучэнне гісторыі бібліятэчнай справы было працягнута ў 2019–2021 гг. у навукова-даследчых работах “Гісторыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў асобах” і “Выбітныя асобы ў станаўленні і развіцці бібліятэчнай справы Беларусі першай паловы XX ст.”. Вынікам даследаванняў стала сістэматызаваная фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя пра жыццё і прафесійную дзейнасць заслужаных супрацоўнікаў, ветэранаў бібліятэк, якія стаялі ля вытокаў іх фарміравання, а таксама бібліятэчных работнікаў, што працуюць сёння.

Вывучэнне гісторыі – не адзіная тэма навукова-даследчых работ НББ. За шматгадовую гісторыю бібліятэка правяла шэраг буйных даследаванняў, неаднаразова ўдзельнічала ў комплексных усесаюзных і міжнародных праектах, прысвечаных ролі кнігі і чытання, камплектаванню фондаў і іх узаемавыкарыстанню вядучымі бібліятэкамі краіны: “Бібліятэка і сельская моладзь” (1970–1977), “Стан і перспектывы развіцця фондаў навуковых бібліятэк” (1971–1977), “Кніга і чытанне ў жыцці савецкага грамадства” (1971–1974), “Бягучыя паступленні і іх выкарыстанне ў масавых і дзіцячых бібліятэках” (1971–1975), “Асноўныя прынцыпы арганізацыі адзінай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва” (1972–1973), “Практыка фінансавання і праблемы рацыянальнага фарміравання фондаў ЦБС” (1983–1988), “Дзейнасць масавых бібліятэк па фарміраванні і развіцці духоўных патрэб асобы на этапе развітога сацыялізму” (1980–1988), “Рацыянальнае размяшчэнне і выкарыстанне бібліятэчных рэсурсаў у краіне” (1981–1985) і іншыя [10].

Гістарычнае развіццё краіны патрабавала ад НББ навукова абгрунтаваных адказаў на актуальныя пытанні функцыянавання беларускіх бібліятэк. Шэраг публікацый 1990-х гг. прысвечаны гэтай тэматыцы: “Чытач масавай бібліятэкі” (1990–1991), “Праблемы бібліятэчнага абслугоўвання сельскіх жыхароў маланаселеных пунктаў” (1990–1992), “Бібліятэкі і нацыянальна-культурныя таварыствы” (1991–1992), “Структура і дынаміка дзіцячага чытання” (1994–1998) і іншыя [12]. Пры правядзенні даследаванняў выкарыстоўваліся ў першую чаргу сацыялагічныя метады, таму да калектыву бібліятэкараў далучыліся прафесійныя сацыёлагі.

Праблема недастатковасці плошчаў для абслугоўвання карыстальнікаў, якаснага захоўвання фондаў стаяла перад НББ на працягу дзесяцігоддзяў. У новым стагоддзі дадаліся пытанні, звязаныя з супярэчнасцю ў аб’ектыўным развіцці грамадства, інфармацыйных тэхналогій і немагчымасцю матэрыяльна-тэхнічнай базы састарэлага будынка адпавядаць новым патрабаванням. У пачатку 2000-х гг. быў праведзены шэраг даследаванняў: “Фонд замежнай перыёдыкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: рацыяналізацыя і актуалізацыя камплектавання” (2001), “Чытач Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: пошук шляхоў аптымізацыі абслугоўвання” (2002), “Вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання картачных каталогаў і картатэк чытачамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” (2002), “Рынак інфармацыі і Нацыянальная бібліятэка Беларусі” (2005) [10].

2000-я гады азначыліся ўзвядзеннем новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Распрацоўка канцэпцыі развіцця НББ у цэлым, яе інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтраў, палажэнняў аб новых і ранейшых аддзелах, службовых інструкцый, пераезд, рацыянальнае асваенне новых плошчаў, распрацоўка структуры новай бібліятэкі, яе штатнага раскладу, новага партала бібліятэкі і г. д. – усе складаныя пытанні вырашалі супрацоўнікі бібліятэкі з выкарыстаннем назапашанага навуковага падыходу. Таму большасць з праведзеных у той час даследаванняў насіла лакальны характар і была скіравана на ўдасканаленне дзейнасці самой Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Укараненне інфарматызацыі ў дзейнасць бібліятэкі ў сукупнасці з пераездам у новы будынак у 2006 г. актуалізавала пытанне найбольш эфектыўнага стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў. “Нацыянальная бібліятэка Беларусі на рынку інфармацыйных прадуктаў і паслуг: базы даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўласнай генерацыі і іх стан” (2006), “Электронныя інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іх выкарыстанне чытачамі. Базы даных і вэб-рэсурсы” (2007), «Вывучэнне попыту патэнцыйных карысталь-

нікаў БД "Беларусь: ад мінулага да сучаснага"» (2007–2008), "Эфектыўнасць выкарыстання дапаможных фондаў НББ" (2008–2009) – усе гэтыя даследаванні дапамаглі высветліць, што ў першую чаргу чакаюць карыстальнікі ад рэсурсаў НББ, і найбольш аптымальна арганізаваць працэс іх генерацыі [10].

Нягледзячы на тое, што асноўны клопат бібліятэкі ў першае дзесяцігоддзе новага веку быў скіраваны на вырашэнне ўласных праблем, яна працягвала з гонарам выконваць місію рэспубліканскага метадычнага цэнтра. "Роля і месца публічнай бібліятэкі ў сацыякультурным асяроддзі рэгіёна" (2002–2004), "Інфармацыйныя патрэбнасці насельніцтва аграгарадкоў" (2006–2007), "Бібліятэкі Беларусі" (2008–2009), "Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь" (2009–2011) – усе гэтыя даследаванні дазволілі стварыць навуковую базу для вызначэння вектараў далейшага развіцця бібліятэк краіны [10].

Узровень праведзеных навуковых даследаванняў, дакладнасць іх вынікаў былі высока ацэнены кіраўніцтвам дзяржавы. Пра гэта сведчыць той факт, што выкананне задання «Распрацаваць інфармацыйны рэсурс "Эвалюцыя бібліятэк у кніжнай культуры Беларусі (XI – пачатак XXI стст.)". Стварыць аптымізаваную мадэль сукупнай бібліятэчнай сеткі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе» Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011–2015 гг. было даверана Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Да слова сказаць, "Мадэль сукупнай сеткі", што стала адным з вынікаў даследавання, была пакладзена ў аснову новай рэдакцыі Закона аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь, прынятай у 2014 г., а пазней перанесенай у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры.

У 2013 г. высокі статус Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як навуковай установы быў пацверджаны дакументальна: яна атрымала Пасведчанне аб акрэдытацыі навуковай арганізацыі [11].

Другое дзесяцігоддзе XXI ст. абвастрыла праблему статыстычнага ўліку дзейнасці бібліятэк. Інфармацыйныя тэхналогіі трывала ўкараніліся ў бібліятэчныя працэсы. Пачалі выкарыстоўвацца электронныя інфармацыйныя рэсурсы, дыстанцыйнае абслугоўванне. Але такія інавацыі не знаходзілі адлюстравання ў дзяржаўнай справаздачнасці. Таму шэраг навуковых даследаванняў НББ быў прысвечаны гэтай праблеме: "Статыстычныя паказчыкі і крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк Беларусі" (2009–2012), "Эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк па стварэнні і выкарыстанні электронных інфармацыйных рэсурсаў: метады ацэнкі" (2014–2015), "Стан інфарматызацыі бібліятэк Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе" (2014–2016) і г. д. [10].

Асаблівасцю 2010–2020 гг. стала і тое, што шэраг даследаванняў выконваўся Нацыянальнай бібліятэкай на замову Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Вынікам сталі метадычныя распрацоўкі, якія пасля актыўна выкарыстоўваліся бібліятэкамі краіны ў іх прафесійнай дзейнасці [10].

Навуковыя даследаванні ў галіне кнігазнаўства на працягу ўсяго перыяду існавання Нацыянальнай бібліятэкі мелі некалькі скразных кірункаў.

Асноўным вектарам заўсёды была распрацоўка тэарэтычных і практычных пытанняў фарміравання Нацыянальнага фонду кніжных помнікаў Беларусі, адпрацоўка навуковых метадаў і прынцыпаў адбору дакументаў. Так, НББ ініцыявала і каардынавала працу міжведамаснай камісіі па распрацоўцы "Пераліку асноўных крытэрыяў і прыкмет для ідэнтыфікацыі кніжных помнікаў, якія ўваходзяць у Нацыянальны фонд кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь". З'яўляючыся найбольш аўтарытэтным экспертам у вобласці вызначэння рэдкасці і ўнікальнасці дакумента, бібліятэка стала ажыццяўляць навуковую экспертызу рэдкіх выданняў (друкаваных кніг, рукапісаў, архіўных матэрыялаў і інш.) з калекцый іншых бібліятэк краіны і прыватных збораў [12].

Высокая ацэнка з боку дзяржавы кнігазнаўчых кампетэнцый НББ пацвярджаецца тым фактам, што згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры з 2016 г. на НББ ускладзена місія фарміравання і вядзення Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь, які ствараецца ў мэтах уліку і сістэматызацыі звестак аб кніжных помніках, іх ідэнтыфікацыі і папулярызацыі.

Адна з галоўных праблем, якая з даўняга часу стаяла перад бібліятэкамі краіны ў працэсе фарміравання калекцый рэдкіх і старадрукаваных выданняў, – іх навуковае апісанне. Таму значнай для бібліятэчнай супольнасці краіны стала распрацаваная і ўкаранёная НББ у сярэдзіне 1980-х гг. сістэма крытэрыяў і патрабаванняў да вывучэння і апісання рэдкіх выданняў. У адпаведнасці з ёй навуковая апрацоўка асобніка прадугледжвае апісанне ўсіх яго асаблівасцей – прамых і ўскосных: экслібрысаў, суперэкслібрысаў, пячатак, запісаў уладальнікаў, аўтографаў, вокладак і інш. Такім чынам адкрыўся шлях і межы распаўсюджвання выдання, лёс і гісторыя асобнай кнігі ці калекцыі [12].

У выніку шматгадовай дзейнасці бібліятэкі ў навуковы зварот помнікаў сусветнай кніжнай

культуры ўведзены ўнікальныя калекцыі ўсходніх рукапісаў XIV–XX стст., найкаштоўнейшых архіўных матэрыялаў, інкунабул, палеатыпаў і выданняў другой паловы XVI ст., кірылічных выданняў, беларускіх выданняў XVI–XVIII стст. лацінскім шрыфтам, палонікі XVIII ст., рускага грамадзянскага друку, рускага эмігранцкага друку 1917–1939 гг. і іншых з фондаў НББ. Некаторыя выданні сталі цэнтральнымі экспанатамі Музея кнігі, адкрытага ў 2007 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Наступны важны кірунак кнігазнаўчых даследаванняў – вывучэнне гістарычных кнігазбораў, у першую чаргу айчынных, якія з'яўляюцца часткай культурнай спадчыны нацыі. НББ ажыццявіла бібліяграфічную рэканструкцыю беларускіх гістарычных кніжных збораў з адначасовым стварэннем паўнатэкставых баз даных, у тым ліку найбольш каштоўных кніжных помнікаў ("Radziviliana", "Бібліятэка Храптовічаў", "Бібліятэка Н. А. Янчука" і інш.). Акрамя таго, установа актыўна ўдзельнічала ў праектах па навуковым апісанні і стварэнні электронных копій унікальных помнікаў культуры, якія маюць вялікае міжнароднае значэнне – "Арыстоцелева брама", "Слуцкае Евангелле", "Нясвіж – культурны цэнтр Еўропы і нацыянальны помнік", "Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар першай трэці XVI ст.", "Гісторыя кніжнай культуры Падляшша" [12].

Сярод найбуйнейшых навуковых праектаў міжнароднага ўзроўню апошніх гадоў – грандыёзны праект па факсімільным узнаўленні спадчыны Ф. Скарыны, прымеркаваны да 500-годдзя выдання першай беларускай і ўсходнеславянскай кнігі (2017). Факсімільнае выданне кніг Ф. Скарыны дазволіла ўпершыню сабраць поўны рэпертуар прац, надрукаваных ім у Празе і Вільні. У рамках праекта факсімільнае выданне было перададзена ў дар установам культуры і адукацыі, найбуйнейшым бібліятэкам свету, міжнародным грамадскім арганізацыям. Усяго больш як 300 устаноў Беларусі і больш як 120 устаноў 70 замежных краін атрымалі ў дар поўны камплект выданняў Ф. Скарыны. Гэта бібліятэкі, навуковыя і адукацыйныя ўстановы, архівы, музеі, грамадскія арганізацыі [11].

Высокі ўзровень кнігазнаўчых даследаванняў і назапашаны досвед дазволіў НББ стаць у 2004 г. арганізатарам Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў – аўтарытэтнай канферэнцыі для спецыялістаў-практыкаў (бібліятэкараў, архівістаў, музеязнаўцаў) і навуковых работнікаў. Штогод на пляцоўцы НББ збіраецца больш за 300 кнігазнаўцаў, каб падзяліцца вопытам і дасягненнямі ў справе зберажэння нацыянальнай кніжнай спадчыны.

З самага пачатку функцыянавання бібліятэкі адным з галоўных напрамкаў яе навуковай працы стала даследаванне праблем бібліяграфазнаўства і практычнай бібліяграфіі. Прыярытэтная задача НББ у галіне бібліяграфазнаўства – гэта вывучэнне тэорыі, гісторыі, методыкі арганізацыі нацыянальнай бібліяграфіі. Работа бібліятэкі па забеспячэнні развіцця нацыянальнай бібліяграфіі шматаспектная. Яна ўключыла ў сябе распрацоўку тэрміналогіі (у тэрміналагічнае поле ўключаны паняцці: *нацыянальная бібліяграфія*, *нацыянальны дакумент*, *беларусазнаўчы дакумент*, *беларусіка*, *дакумент беларускага замежжа*) і выяўленне аб'ектаў бібліяграфічнага ўліку; падрыхтоўку важных нарматыўных прававых дакументаў; вызначэнне функцый бібліяграфічных устаноў па стварэнні нацыянальнай бібліяграфіі. Спецыялістамі НББ распрацаваны праграма развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, праграма бібліяграфічнага забеспячэння беларусазнаўства, а таксама асноўныя дакументы па краязнаўчай дзейнасці бібліятэк як важнай часткі беларусазнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці [12].

Асаблівая ўвага заўсёды аддавалася стварэнню крыніц бібліяграфічнай інфармацыі. Ужо праз два гады пасля заснавання бібліятэкі, у 1924 г. быў выдадзены першы нумар "Летапісу друку". НББ 53 гады ажыццяўляла рэгістрацыю друкаванай прадукцыі.

З 1960 г. бібліятэка распачала выпуск штомесячнага бібліяграфічнага бюлетэня "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку", ён выходзіць і сёння. Выданне інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, якія паступаюць у фонд Нацыянальнай бібліятэкі, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні. Дзякуючы ўніверсальнаму зместу, спалучэнню бібліяграфічнай інфармацыі з разнастайнымі аналітычнымі матэрыяламі выданнем цікавяцца чытачы незалежна ад узроўню інфармацыйнай культуры, узросту, адукацыі, прафесійных і асабістых інтарэсаў.

За ўсю гісторыю бібліятэкі яе супрацоўнікамі былі складзены фундаментальныя бібліяграфічныя паказальнікі ("Кніга Беларусі. 1517–1917", "Францыск Скарына: спадчына і пераемнікі", "Чарнобыль" і інш.), накіраваныя на фарміраванне і задавальненне інфармацыйных патрэб розных катэгорый карыстальнікаў (навукоўцаў, прадстаўнікоў розных галін прамысловасці, сацыяльнай сферы, органаў кіравання, студэнтаў і г. д.) [12].

Акрамя таго, НББ рэгулярна праводзіла аналіз выкарыстання бібліяграфічных дапаможнікаў бібліятэкамі краіны і прапагандавала біб-

ліяграфічныя веды, пра гэта сведчаць даследаванні: "Вывучэнне эфектыўнасці рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў кіраўніцтве чытаннем" (1973), "Эфектыўнасць вядзення запісаў назіранняў бібліятэкараў за выкарыстаннем рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў у працэсе кіраўніцтва чытаннем чытачоў" (1981), "Беларуская бібліяграфія як частка бібліяграфічных рэсурсаў НББ" (1992) і іншыя [13].

Вынікі навуковай дзейнасці НББ знаходзяць адлюстраванне ў публікацыях, дакладах і паведамленнях супрацоўнікаў на навуковых канферэнцыях і семінарах, што ладзяцца ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. За стагадовую гісторыю існавання бібліятэкі на старонках прафесійных выданняў выйшла каля 5 тысяч артыкулаў яе работнікаў [2; 14].

Выдавецкая дзейнасць на ўсіх этапах гістарычнага развіцця Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі была адным з асноўных складнікаў яе функцыянавання як галоўнага навукова-даследчага і навукова-метадычнага цэнтра бібліятэчнай справы краіны. Штогод выходзяць навуковыя зборнікі "Бібліятэчны веснік" (ад 2008 г.) і "Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі" (ад 1995 г.). Яны ўключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Асаблівую цікавасць уяўляюць зборнікі матэрыялаў канферэнцый, якія штогод праходзяць у бібліятэцы (Міжнародны кангрэс "Бібліятэка як феномен культуры", Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні і інш.).

Нароўні з навуковымі, бібліятэка выпускае шэраг метадычных выданняў. У 2014 г. НББ заснавала серыю "БібліяКансультант", у рамках якой штогод выходзяць як друкаваныя, так і электронныя выданні, што маюць больш прыкладное значэнне, адказваюць на надзённыя пытанні бібліятэкараў.

Ёсць у галоўнай кніжніцы Беларусі і часопіс "Бібліятэчны свет", які адзначае сёлета 26-годдзе. У выданні, заснавальнікі якога Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, публікуюцца матэрыялы, што адлюстроўваюць дзяржаўную культурную палітыку, стан і перспектывы развіцця бібліятэк розных сістэм і ўстаноў, замежны вопыт. Часопіс выдаецца 6 разоў у год тыражом блізу 1 тыс. экз. кожнага нумара.

Сёння выдавецкая прадукцыя НББ вылучаецца не толькі змястоўнай разнастайнасцю, але і высокім узроўнем паліграфічнага выканання. Сучасныя тэхнічныя сродкі даюць магчымасці разгарнуць выпуск самай рознай прадукцыі. Гэта дазваляе НББ прымаць замовы на выдавецкую прадукцыю ад іншых арганізацый [11].

Сёлета Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўваходзіць у сваё асабістае новае стагоддзе. Яно паставіць перад установай чарговыя мэты, якія будуць абавязкова дасягнуты праз навуковае вызначэнне шляхоў і лагічнае абгрунтаванне паспяховых перспектыў для развіцця.

### Спіс літаратуры


1. **Становление и развитие библиотек Беларуси** : архивные документы [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2020. – Режим доступа: https://belaruslibrary.nlb.by/history. – Дата доступа: 18.05.2022.
2. **Симановский, И. Б.** Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И. Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР : докл. науч. конф., Москва, 23–26 дек. 1957 г. / Гос. б-ка СССР ; под ред. Ф. С. Абрикосовой. – М., 1958. – С. 191–286.
3. **Библиотечное дело в БССР** : документы и материалы, 1941–1958 : сборник / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина и др. ; [сост. Л. Н. Бурлак и др.] ; редкол.: К. С. Санько (отв. ред.) и др. – Минск : Выш. шк., 1984. – 287 с.
4. **Бібліятэчная справа на Беларусі** : дакументы і матэрыялы, 1959–1975 : зборнік / Нац. б-ка Беларусі, Дзярж. кам. па арх. і справаводству Рэспублікі Беларусь ; [склад. К. А. Навуменка (адк. склад.) і інш.] ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна (адк. рэд.) і інш. – Мінск : НББ, 2000. – 533 с.
5. **Бібліятэчная справа на Беларусі** : дакументы і матэрыялы, 1976–1990 : зборнік / Нац. б-ка Беларусі, Дзярж. кам. па арх. і справаводству Рэсп. Беларусь ; [склад. К. А. Навуменка (адк. склад.), В. А. Рыхлова] ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна (адк. рэд.) і інш. – Мінск : НББ, 2004. – 595 с.
6. **Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў дакументах.** 1922–2006 гг. / Нац. б-ка Беларусі ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна (адказ. рэд.) і інш. – Мінск, 2007. – 792 с.
7. **Бібліятэчная справа на Беларусі** : дакументы і матэрыялы. IX – пачатак XX ст. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. В. А. Рынкевіч ; рэдкал. Л. Г. Кірухіна (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2008. – 167 с.
8. **Бібліятэчная справа Беларусі ў дакументах і матэрыялах** [Электронны рэсурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2022. – Рэжым доступу: https://bibdelo.nlb.by. – Дата доступу: 18.05.2022.
9. **Мотульский, Р. С.** Из прошлого в будущее. Библиотеки Беларуси : в 2 ч. / Р. С. Мотульский. – Минск : БелЭн, 2011.
10. **Исследования в области библиотековедения** [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2022. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/o-biblioteke/nauchnaya-deyatelnost/issledovaniya-v-oblasti-bibliotekovedeniya. – Дата доступа: 18.05.2022.
11. **Беларусь Библиотечная** [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2019. – Режим доступа: https://belaruslibrary.nlb.by. – Дата доступа: 18.05.2022.
12. **Национальная библиотека Беларуси:** новое здание – новая концепция развития : к 85-летию Национальной библиотеки Беларуси / М. Г. Алейник и др. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2007.
13. **Исследования в области библиографии** [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2022. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/o-biblioteke/nauchnaya-deyatelnost/issledovaniya-v-oblasti-bibliografii. – Дата доступа: 18.05.2022.
14. **Публикации сотрудников НББ** [Электронный ресурс] // Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2022. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/o-biblioteke/nauchnaya-deyatelnost/publikatsii-sotrudnikov-nbb. – Дата доступа: 18.05.2022.